глядаў тэлеперадач. Згодна з афіцыйнай статыстыкай, самадзейнасцю займаюцца толькі каля 10 % насельніцтва, г.зн. яна займае параўнальна невялікі аб'ём у агульным бюджэце вольнага часу людзей. Усё гэта сведчыць аб тым, што неабходна не толькі тэарэтычнае пераасэнсаванне сутнасці і зместу паняцця «мастацкая самадзейнасць», замена яго на паняцце «аматарства», якое менш уражлівае і адэкватна адлюстроўвае рэчаіснасць, але і кардынальныя перамены ў сістэме арганізацыі і якасці той з'явы, што вызначана гэтым паняццем.

ЛІТАРАТУРА

*1. Каргин А.С.* Народнае художественное творчество: Структура, формы, свойства. М., 1990. *2. Максимов В.Н.* Художественная самодеятельность: дефиниции и реальность // Народное творчество и современность. М., 1982. С. 195. *3. Маркс К., Энгельс Ф.* Соч. 2-е изд. Т. 13. С. 17. *4. Гусев В.Е.* Эстетика фольклора. Л., 1967. *5. Маркс К., Энгельс Ф.* Соч. 2-е изд. Т. 42. С. 93—94. *6. Маркс К., Энгельс Ф.* Из ранних произведений. М., 1956. С. 563—597. *7. Маркс К., Энгельс Ф.* Соч. 2-е изд. Т. 25. Ч. 3. С. 386. *8. Маркс К., Энгельс Ф.* Соч. 2-е изд. Т. 23. С. 100. *9. Ожегов С.И.* Словарь русского языка. М., 1990. *10.* Духовное производство: Социально-философский аспект проблемы духовной деятельности. М., 1981. С. 252. *11. Алексеев Э.* Фольклор в контексте современной культуры: Размышления о судьбах народной песни. М., 1988. С. 123. *12.* Идеи эстетического воспитания. М., 1973. Т. 2. С. 262. *13. Куликов Ю.М.* Культурологический аспект истории художественной самодеятельности // Народное творчество и современность. М., 1982. *14. Мазаев А.У.* К вопросу о изучении современного любительского ("самодеятельного") художественного творчества // Народное творчество и современность. М., 1982. *15. Максімаў В.Н.* Мастацкая самадзейнасць і мастацкая культура // Народная творчасць і культура развітога сац. грамадства. М., 1964. С. 75.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**І.А.МАЛАХАВА (МІК)**

## АНАЛІЗ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ТВОРЧАГА РАЗВІЦЦЯ АСОБЫ (да пытання аб крэатыўнасці)

Паспяховае вырашэнне актуальных праблем рознага характару настойліва патрабуе актыўнага ўключэння ў грамадскі абыходак творчага патэнцыялу практычна кожнай асобы. Перад намі вялікай значнасці праблема. Яе сутнасць у рэзка абвостранай супярэчлівасці паміж патрэбамі грамадства ў творчай дзейнасці яго членаў, якія маюць велізарныя патэнцыяльныя магчымасці, з аднаго боку, і ўзроўнем задавальнення гэтых патрэб і рэалізацыі патэнцый — з другога. Праблема творчага самаразвіцця асобы з'яўляецца востраактуальнай для кожнага чалавека і патрабуе вялікіх намаганняў для яе вырашэння незалежна ад узросту, адукацыі, стылю дзейнасці, сацыяльнага паходжання. Акрамя таго, пытанне развіцця, выхавання і выкарыстання творчага патэнцыялу кожнай асобы ўжо даўно ператварылася ў сацыяльную неабходнасць. Пад творчым патэнцыялам трэба разумець не толькі здольнасць да стварэння новага ў навуцы альбо мастацтве, але і нестандартнасць

адносін да сябе, сваёй працы, узаемаадносін з іншымі людзьмі, да вырашэння самых розных праблемных сітуацый і наогул да жыцця ў цэлым.

Такім чынам, узнікае неабходнасць даследавання псіхалагічных заканамернасцей і ўмоў развіцця творчых здольнасцей, асобасных якасцей, асаблівасцей існавання механізма творчасці. Больш таго, ранняя дыягностыка крэатыўнасці, пачынаючы з дзіцячага ўзросту, садзейнічае найбольш поўнай самарэалізацыі, самаактуалізацыі і самаразвіццю асобы. Чалавек, які валодае магутным творчым патэнцыялам, творчымі здольнасцямі, мае свой асаблівы стыль жыцця, які характарызуецца багаццем і разнастайнасцю сувязей з навакольным асяроддзем, людзьмі, шматзначнасцю ўспрымання любых з'яў рэчаіснасці. Відавочна, што ад таго, наколькі эфектыўна будзе вырашана сёння праблема развіцця творчага патэнцыялу кожнага дзіцяці, залежыць далейшы рух усяго грамадства па шляху прагрэсу, будучыня ўсёй планеты.

Праблема творчасці, якая хвалявала даследчыкаў з самых старажытных часоў, не страціла сваёй актуальнасці і ў сучасны момант. Магчыма, яе можна аднесці да т.зв. вечных праблем, таму што вельмі складаныя шляхі яе вырашэння і вялікая значнасць у жыцці кожнага чалавека. Так, апошні ўсплёск увагі да гэтай праблемы адносіцца да сярэдзіны 50-х гг. і працягваецца па сённяшні дзень, а выкліканы ён усведамленнем грамадскай значнасці пытанняў творчасці і ўнутранай логікай развіцця псіхалогіі як навукі.

Даследчыкі мінулага (Ж.Піажэ, Л.Гордан) бачылі ў творчасці з'яву надзвычайную і выключную. У іх работах адзначалася неабходнасць своечасовай дыягностыкі здольнасцей асобы для стварэння найбольш перспектыўнай групе спецыяльных умоў, якія будуць садзейнічаць развіццю таленту кожнай асобы.

Адраджэнне ў сярэдзіне 50-х гг. інтарэсу да псіхалогіі творчасці тлумачыцца перш за ўсё глыбокімі сацыяльнымі прычынамі. Так, амерыканскія вучоныя сцвярджаюць, што для ЗША выяўленне і выхоўванне творчых асоб з'яўляецца праблемай агульнаграмадскага значэння, таму што, як адзначае, напрыклад, К.Тэйлар, «творчая дзейнасць мае вялікі ўплыў не толькі на навуковы прагрэс, але і на ўсё грамадства наогул, а тыя дзяржавы, якія змогуць лепш за іншыя апазнаць творчыя асобы, развіць іх і стварыць для іх самыя спрыяльныя ўмовы, будуць мець велізарныя перавагі» [1].

Асабліва важным творчы падыход выступае ва ўмовах рэзкіх перамен у грамадскім жыцці, таму што дазваляе пераадолець усякія складанасці, намеціць новыя нечаканыя мэты, забяспечыць большую свабоду выбару, і, такім чынам, большую свабоду ў дзеяннях. У апошніх даследаваннях замежных псіхолагаў творчая дзейнасць вызначаецца ў якасці першаважнай для разумовага здароўя і ўнутранага задавальнення. Адзнача-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ецца, што яна з'яўляецца сапраўдным інструментам кіравання як дзіцячымі імпульсамі, так і асобай дарослага чалавека. А.Осбарн — адзін з амерыканскіх псіхолагаў — сцвярджаў, што гісторыя цывілізацыі — гэта па сутнасці «справаздача аб чалавечай творчай здольнасці, а ўяўленне з'яўляецца краевугольным каменем чалавечых намаганняў, якія заваявалі свет» [2].

Такім чынам, зварот увагі да праблем творчасці выкліканы перш за ўсё ўсведамленнем грамадскай значнасці пытанняў творчых здольнасцей, а таксама ўнутранай логікай развіцця псіхалогіі як навукі. Пытанні творчай дзейнасці, выхавання крэатыўнасці паўстаюць як першачарговыя ў сучаснай адукацыі ЗША. «Крэатыўнасць» — яшчэ нядаўна рэдкае слова ў вуснах педагогаў, вучоных, прамыславікоў, слова, якое ўжывалася амаль выключна толькі сярод дзеячаў мастацкага выхавання, — стала ўсеагульным дасягненнем да такой ступені, што, магчыма, вымаўляецца і ў сне», — пісаў В.Лоўнфельд — адзін з выдатных прадстаўнікоў эстэтычнага выхавання ў ЗША [3].

Што датычыцца вызначэння сэнсу самога тэрміна «крэатыўнасць», то, на наш погляд, цікавымі з'яўляюцца думкі амерыканскага псіхолага Э.Фрома, які прапанаваў наступнае азначэнне: «Гэта здольнасць здзіўляцца і пазнаваць, гэта ўменне знаходзіць рашэнне ў нестандартных умовах, гэта накіраванасць на адкрыццё новага і здольнасць да глыбокага ўсведамлення свайго вопыту» [4]. Такім чынам, зыходзячы з гэтай фармуліроўкі, крытэрыем творчасці з'яўляецца не якасць выніку, а характарыстыкі і працэсы, якія актывізуюць творчую прадуктыўнасць. Калі гаворка ідзе аб выхаванні крэатыўнасці, то маецца на ўвазе развіццё здольнасці і схільнасць да такіх заняткаў, у выніку якіх будзе атрыманы творчы прадукт. Значыць, паняцце крэатыўнасць (ад лац. crea — ствараць) ахоплівае адзінства мысліцельных і асобасных якасцей, якія садзейнічаюць выяўленню творчасці.

Складанасць праблемы творчасці і развіцця творчых якасцей дзяцей абумоўлена прысутнасцю мноства рознабаковых фактараў, што вызначаюць як прыроду, так і праяўленне творчых якасцей. У асноўным гэтыя фактары можна аб'яднаць у тры найбольш агульныя групы: першая ўключае прыродныя задаткі і індывідуальныя асаблівасці, якія акрэсліваюць фарміраванне творчай асобы; другую групу складаюць усе формы ўплыву сацыяльнага асяроддзя на развіццё і праяву творчых здольнасцей; трэцяя група ўяўляе сабой залежнасць развіцця крэатыўнасці ад характару і структуры дзейнасці.

Паколькі дзеці яшчэ не ўключаны ў грамадска-карысную дзейнасць, вынікі іх творчасці не могуць ацэньвацца з пазіцыі «аб'ектыўнай» значнасці. Для даследавання дзяцей прапануецца выкарыстоўваць т.зв. «суб'ектыўныя паказчыкі» крэатыўнасці, якія накіраваны на ацэнку самога працэсу, стылю масліцельнай дзейнасці, а не на вынік ажыц-

цяўлення творчай дзейнасці. Усе прапанаваныя тэсты на крэатыўнасць накіраваны на выяўленне некаторых першасных паказчыкаў крэатыўнасці, якія дазваляюць выявіць «суб'ектыўную крэатыўнасць», ці творчы стыль дзейнасці безадносна да аб'ектыўнай навізны і значнасці яе вынікаў. Гэтыя першасныя паказчыкі як элементы крэатыўнасці — агульныя для дзяцей і дарослых і з'яўляюцца фундаментам для ўсякай формы прадуктыўнай дзейнасці, а таксама агульныя для ўсіх відаў творчай дзейнасці (навуковай, мастацкай і г.д.).

У навуковай літаратуры вылучаюцца розныя крытэрыі і паказчыкі крэатыўнасці: «шырыня катэгарызацыі» як аддаленасць асацыяцыі; бегласць мыслення, якая характарызуецца багаццем і разнастайнасцю ідэй, асацыяцый; гібкасць мыслення як здольнасць пераходзіць дастаткова хутка ад адной катэгорыі да другой, ад аднаго шляху вырашэння задачы да другога; арыгінальнасць, нестандартнасць мыслення; багацце фантазіі; развітае ўяўленне; здольнасць да творчага натхнення. Тут неабходна заўважыць, што замежныя даследчыкі творчасці распрацавалі вялікае мноства паказчыкаў крэатыўнасці, сродкаў яе выяўлення і развіцця. Так, амерыканскі псіхолаг Дж.Гілфард, які прапанаваў кубічную «мадэль структуры інтэлекту», выдзяляў у творчым мысленні пяць асноўных разумовых аперацый: давергентнае і канвергентнае мысленне, пазнанне, выбар з памяці і ацэначныя дзеянні. А ўсяго Гілфард апісаў 120 элементарных разумовых аперацый, кожная з якіх выяўляецца з дапамогай спецыяльна распрацаваных тэстаў.

Творчы патэнцыял асобы абумоўлівае дзейнасць розных паводле сваіх якасцей псіхалагічных праяў (мысленне, эмоцыі, уяўленне, воля). На нашу думку, у структуры дзіцячай крэатыўнасці ўяўленне з'яўляецца асноўным псіхалагічным утварэннем, асяродкам творчага патэнцыялу. Прынята размяжоўваць узнаўляльнае і творчае ўяўленне. Пры гэтым у адрозненне ад узнаўляльнага творчае ўяўленне — гэта стварэнне новых, незалежных вобразаў, якія рэалізуюцца ў арыгінальных прадуктах дзейнасці. Асабліва яскрава гэты працэс праяўляецца ў дзяцінстве. Па словах Л.Выгоцкага, зародкі творчага ўяўлення праяўляюцца яшчэ ў гульнях жывёлін, не гаворачы ўжо пра дзяцей. Гульня — гэта не просты ўспамін аб перажытых уражаннях, гэта творчая іх перапрацоўка, у працэсе якой дзіця камбінуе даныя вопыту, каб стварыць новую рэальнасць, адпаведную яго інтарэсам і запатрабаванням [5, с. 10]. Але ўлічваючы тое, што ўяўленне «працуе» толькі з матэрыяламі, ўзятымі з жыцця, патрэбна клапаціцца аб тым, каб дзіця магло развіваць яго і скарыстаць для вырашэння адпаведных задач. А дзеля гэтага неабходна стварыць абставіны, багатыя імпульсамі і стымуламі, прываблівацъ дзіця да мноства розных заняткаў. Пры гэтым моцнай асновай для развіцця ўяўлення павінна быць накіраваная актыўнасць, уключэнне фантазіі дзяцей у вырашэнне якой-небудзь канкрэтнай праблемы.

Вялікую ролю ў структуры крэатыўнасці адыгрываюць рэгулятарныя працэсы — эмоцыі і пачуцці, сфера самарэгуляцыі і самакантролю. Было даказана, што ва ўмовах адсутнасці крытыкі, ацэнак ці стрэсу дзеці намнога лепш выконвалі творчыя заданні. Эмоцыя страху разглядаецца наогул як поўнасцю супрацьлеглая творчаму працэсу. Падтрымка адноснай самастойнасці дзіцяці, выяўленне павагі да яго і адсутнасць празмернай патрабавальнасці садзейнічаюць фарміраванню творчых здольнасцей.

Такім чынам, крэатыўнасць — вельмі неабходнае звяно структуры асобы любой індывідуальнасці, і садзейнічаць развіццю творчых якасцей — галоўная задача ўсіх, хто мае дачыненне да выхавання дзяцей. Больш таго, для педагога ўсе дзеці павінны быць «патэнцыяльнымі крэатывамі, і роля яго заключаецца ў тым, каб распазнаць індывідуальную крэатыўнасць дзіцяці і імкнуцца развіваць яе.

Неабходна адзначыць, што творчыя здольнасці, ці творчы патэнцыял, закладзены ў кожным дзіцяці, патрэбна толькі ўмець раскрыць іх і даць магчымасць праявіцца найбольш яскрава. Як вядома, талент — з'ява універсальная і, значыць, чым да большай колькасці відаў творчай дзейнасці далучаць дзяцей, тым найбольш поўна, яскрава і шматгранна праявяцца асаблівасці кожнай асобы, што з'яўляецца актуальным для сучаснай сістэмы адукацыі і выхавання. Некаторыя замежныя даследчыкі творчасці лічаць, што існуе нейкі «кантынуум таленавітасці» людзей ад высокаадораных, якія імкнуцца да поспехаў у розных відах дзейнасці, да пазбаўленых творчага патэнцыялу, у якіх не хапае здольнасцей ці матывацыі.

Навукай даказана, што вельмі эфектыўным сродкам вырашэння праблемы развіцця крэатыўнасці дзіцяці з'яўляецца мастацтва, і ў прыватнасці музычная дзейнасць на самых розных узроўнях (ад аматарскага музіцыравання да ўдзелу ў прафесійным музычным тэатры). Дарэчы, В.Лоўнфельд, які праводзіў даследаванне крэатыўнасці на матэрыяле мастацтва, лічыць, што цяпер даказана неабходнасць мастацкага вопыту для ўсіх дзяцей, асабліва для тых, у каго немагчыма развіць крэатыўнасць на навуковым матэрыяле, бо творчая здольнасць можа быць перанесена з аднаго матэрыялу на другі. Гэта павінна ўзмацніць пазіцыі мастацкіх прадметаў у сістэме школьнай работы [6].

Яшчэ вялікія мысліцелі мінулага Платон і Арыстоцель пісалі аб выхаваўчай сіле музыкі. Цікава, што гэтыя праблемы яны разглядалі ў працах, якія ў абодвух носяць назву «Палітыка». «Няма сумнення, — лічыў Арыстоцель, — што чым больш мы знаходзімся пад уплывам кожнай справы, тым бліжэй і больш непасрэдна ўдзельнічаем у ёй самі... што толькі актыўныя заняткі музыкай могуць мець сапраўдную адукацыйную значнасць... а калі так, то музыка неабходна павінна ўваходзіць у праграму выхавання» [7]. А Платон аднойчы выказаўся,

што калі чалавек не музыкант, то ён не можа быць настаўнікам. Значыць, з усіх школьных дысцыплін адзінай па-сапраўднаму выхаваўчай з'яўляецца музыка, таму што яна не толькі трэніруе мозг, але развівае і робіць высакароднымі пачуцці.

Музычны вопыт прыносіць дзецям унутранае заспакаенне — стан, якога цяжка дасягнуць у наш складаны час. У душы кожнага чалавека ёсць жаданне творчага росту, жаданне пазнаць і рабіць дабро, зразумець, у чым заключаецца яго чалавечая сутнасць. Але гэтае жаданне знікне, загіне, атрафіруецца як нетрэніраваны мускул, калі яго не развіваць і не выкарыстоўваць. Музыка — гэта радасць дзейнасці, радасць актыўнага ўдзелу ў творчым працэсе. Музыка, на думку Р.Слэка, перш за ўсё выхоўвае музычную дысцыпліну, жаданне ўдасканальваць індывідуальнае і калектыўнае выкананне, і гэтае ўдасканальванне прыносіць вялікае эмацыянальнае задавальненне. Акрамя таго, музычнае выхаванне ўяўляе сабой стымуляванне разумовага развіцця з дапамогай музыкі, а таксама з'яўляецца каталізатарам эмоцый і пачуццяў, без чаго немагчыма дасягненне поўнай сталасці.

Мы салідарныя з думкай В.Сухамлінскага, які лічыў, што «музычнае выхаванне — гэта не выхаванне музыканта, а перш за ўсё выхаванне чалавека» [8, с. 124]. Паколькі музыка з'яўляецца ўніверсальным сродкам выхавання, то арганічнае спалучэнне музыкі з іншымі відамі мастацтва ў адзіны арганізм, якім уяўляецца музычны тэатр, у яшчэ большай ступені будзе садзейнічаць актывізацыі творчага патэнцыялу дзіцяці, развіццю багатага ўяўлення і фантазіі. Музычны тэатр, з'яўляючыся сінтэтычным відам мастацкай дзейнасці, дзе захапляючы сюжэт, сцэнічная мова, мастацкае афармленне падпарадкоўваецца галоўнаму— музыцы, — адкрывае ўвогуле новыя магчымасці для развіцця дзіцячай крэатыўнасці.

Вельмі важна, каб у аснове выхавання і навучання дзяцей на ўсіх этапах стаў галоўным прынцып, які вызначае развіццё чалавецтва,— творчасць. На думку Л.Выгоцкага, «творчасць выпадае на долю ўсіх у большай ці меншай ступені, яна ж з'яўляецца нармальным і пастаянным спадарожнікам дзіцячага развіцця» [5, с. 32]. Калі мы паспрабуем прааналізаваць паводзіны чалавека, усю яго дзейнасць, то без асаблівай цяжкасці заўважым, што ў гэтай дзейнасці вылучаюцца два асноўныя віды ўчынкаў. Адзін від можна назваць узнаўляльным ці рэпрадуктыўным. Яго сутнасць заключаецца ў тым, што чалавек узнаўляе ці паўтарае ўжо раней створаныя прыёмы паводзін альбо ўзнаўляе былыя ўражанні. Акрамя ўзнаўляльнай, у паводзінах чалавека няцяжка заўважыць і творчую, ці камбінуючую, дзейнасць, да якой адносіцца стварэнне новых вобразаў, ці дзеянняў, аналага якім не было ў папярэднім вопыце. Якраз творчая дзейнасць чалавека робіць яго істотай, якая відазмяняе сваё цяперашняе становішча, накіравана ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

будучыню і актыўна стварае яе.

Такім чынам, творчасць — сінонім арыгінальнага складу розуму, г.зн. здольнасці пастаянна ламаць стандартныя рамкі назапашанага вопыту. Творчы розум — гэта розум актыўны, дапытлівы, які знаходзіць праблемы там, дзе іншыя іх не заўважаюць; ён здольны прымаць свае, ні ад каго не залежныя рашэнні: ён адмаўляе тое, што яму навязваюць, па-новаму асэнсоўвае прадметы і паняцці. Усе гэтыя якасці праяўляюцца ў працэсе творчасці. Творчасць — гэта натуральная прыродная функцыя мозга, якая праяўляецца і рэалізуецца ў дзейнасці адпаведна прысутным спецыяльным здольнасцям. Існуе творчасць геніяў і творчасць у выкананні простых штодзённых спраў. Творчасць не трэба разумець толькі як працу пісьменніка, мастака, вучонага ці канструктара, паколькі яна можа праяўляцца і ў выкладанні, і ў гандлі, і ў кулінарнай справе, і ў любой іншай дзейнасці, а вынікамі гэтай дзейнасці з'яўляюцца не толькі канкрэтныя прадукты ці ідэі, але і самі дзеянні. Творчасць, такім чынам, трэба разглядаць як нейкі спецыфічны стыль дзейнасці, а не від яе (праца мастака, пісьменніка і г.д.). Гэты стыль не заўжды супадае са спецыяльнымі здольнасцямі да якой-небудзь канкрэтнай дзейнасці: так, выдатны музыкант аказваецца толькі выканаўцам чужых твораў, не здольным самастойна стварыць музыку. Разам з тым крэатыўнасць можа праяўляцца ў аднаго і таго ж чалавека ў розных відах дзейнасці: выдатны музыкант-выканаўца можа быць і выдатным кампазітарам, і педагогам, і крытыкам (прыкладаў гісторыя музыкі ведае дастаткова). Наконт гэтага добра пісаў Л.Выгоцкі: «Творчасць на самой справе існуе не толькі там, дзе яна стварае вялікія гістарычныя творы, але і там, дзе чалавек уяўляе, камбінуе і стварае што-небудзь новае, якой бы крупінкай ні здавалася гэта новае ў параўнанні са стварэннямі геніяў» [5, с. 6].

Акрамя таго, крэатыўнасць уяўляе сабой не адзін фактар, а сукупнасць розных здольнасцей, кожная з якіх можа быць прадстаўлена ў рознай ступені ў таго ці іншага індывіда. У агульным выглядзе творчую здольнасць можна азначыць як комплекс якасцей асобы, якія забяспечваюць ёй магчымасць праяўляць сябе ў любым відзе чалавечай дзейнасці асобай творчай. Як правільна зазначаў В.Сухамлінскі, «творчасць — гэта дзейнасць, у якой раскрываецца духоўны свет асобы, гэта своеасаблівы магніт, які прываблівае чалавека да чалавека» [8, с. 149].

Такім чынам, аналіз даследаванняў па праблеме развіцця крэатыўнасці асобы паказаў, што праблема творчасці, якая ва ўсе часы хвалявала даследчыкаў, не страціла сваёй актуальнасці і на сучасным этапе, які вылучаецца шматграннасцю і разнастайнасцю вывучэння, а таксама павышанай увагай да псіхолага-педагагічных аспектаў творчасці.

ЛІТАРАТУРА

*1. Taylor C.W.* Jhe Minnesota studies of creative thinking // Taylor C.W. (Ed) Widening horizons in creativity N.Y., 1964. *2. Osborn A.* Applied imagination. N.Y., 1957. *3. Lownfeld V.* Creativity and Art Education // School Arts. Vol. 59. October, 1959. N 2. P. 5. *4. Fromm E.* Jhe creative attitude. In H. Anderson (Ed.), Creativity and its cultivation. N.Y. Harper and Kow, 1959. *5. Выготский Л.* Воображение и творчество в детском возрасте. М., 1991. *6. Lowenfeld V.* Jhe Adolesnes of Art Education // Art Education. Vol. 10. 1957. N 7. P. 8. *7. Аристотель.* Политика. М., 1911. С. 206—207. *8. Сухомлинский В.* О воспитании. М., 1973.

**С.Б.МАЙСЕЙЧУК (МІК)**

## ДА ПЫТАННЯ АБ СІСТЭМНЫМ ПАДЫХОДЗЕ ДА ТВОРЧАЙ АДОРАНАСЦІ ДЗЯЦЕЙ-ІНВАЛІДАЎ

Перад грамадствам на працягу ўсяго развіцця стаяла праблема ўзбагачэння інтэлектуальнага патэнцыялу. У цяперашні час педагогі і псіхолагі б'юць трывогу аб пагаршэнні творчага генафонду, звяртаюць асаблівую ўвагу на негатыўныя вынікі сацыяльнай практыкі, якая прыводзіць да нівеліравання індывідуальнасці дзіцяці. Гэта асабліва моцна праяўляецца ў практыцы школьнай адукацыі і выхавання. А між тым мэтанакіраванае фарміраванне здольнасцей ужо ў маленстве важнае не толькі для саміх дзяцей, іх развіцця, але, у першую чаргу, для грамадства ў цэлым, для будучыні. Для яго забеспячэння патрэбны глыбокае тэарэтычнае абгрунтаванне і распрацоўка спецыяльных методык, якія б засноўваліся на творчым вопыце настаўнікаў-наватараў і ўсебаковых сацыялагічных даследаваннях розных груп дзяцей і падлеткаў.

Да ліку найбольш складаных у нашай педагагічнай і псіхалагічнай літаратуры адносіцца праблема дыягностыкі адоранасці дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту. У некаторых выпадках пры вырашэнні гэтай праблемы выкарыстоўваюцца чыста колькасныя метады, розныя тэсты, без уліку біялагічных, псіхалагічных і іншых фактараў. Такі аднабаковы падыход стварае памылковае ўяўленне аб генезісе адоранасці і працэсе яе рэалізацыі. Ураўноўванне людзей па задатках і здольнасцях прыводзіць да фарміравання сярэдняга вучня, пазбаўляючы яго магчымасці праявіць сваю непаўторную індывідуальнасць.

Работа над стварэннем сістэмы выяўлення адоранасці дзяцей пачынаецца з фарміравання метадалагічных прынцыпаў. Нельга не пагадзіцца з меркаваннямі амерыканскіх вучоных, якія ставяць на першы план прынцып вызначэння найбольш ёмістага і практычнага паняцця адоранасці. У навуковай літаратуры існуе шмат падыходаў да вызначэння адоранасці, якія аднак, уключаюць аналіз адзінства індывідуальна-псіхалагічных рыс і навакольных умоў рознай складанасці. У той жа час намі прапануецца сістэмны падыход у вывучэнні праблемы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ